БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

УДК 94 (4) + 284-1 (44)

Валодзіна
Аляксандра Вадзімаўна

# РУХ ВАЛЬДЭНСАЎ
# У КАНЦЫ XII – ПАЧАТКУ XV СТАГОДДЗЯ

Аўтарэферат
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.03 – усеагульная гісторыя

Мінск, 2018

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

Навуковы кіраўнік – **Еўтухоў Ігар Арэставіч**, доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры старажытнага свету і сярэдніх вякоў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Афіцыйныя апаненты: **Тугай Уладзімір Васільевіч**, доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык Цэнтра ўсеагульнай гісторыі і міжнародных адносін ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі";

**Чаркасаў Дзмітрый Мікалаевіч**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры эканамічнай гісторыі УА "Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт".

Апаніруючая арганізацыя – УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка".

Абарона адбудзецца «18» кастрычніка 2018 г. а 16.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.05 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасе: Мінск, вул. Ленінградская, 8 (корпус юрыдычнага факультэта), аўд. 407.

Тэлефон вучонага сакратара: 209-57-09; e-mail: huzhalouski@gmail.com.

З дысертацыяй можна пазнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аўтарэферат разасланы «14» верасня 2018 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
доктар гістарычных навук прафесар А.А. Гужалоўскі

# УВОДЗІНЫ

Гісторыя вальдызму як рэлігійнага руху цікавая і ў XXI ст. тым, што ён захаваўся з XII ст. і мае сваіх вернікаў і сёння. Вальдэнсы як гістарычная з'ява традыцыйна вывучаюцца ў межах рэлігіязнаўства і гісторыі каталіцкай Царквы, а ўласна гістарычны разгляд гэтага руху звычайна не прыцягвае асобнай увагі даследчыкаў. Гэта замінае ўсталяванню сувязі самога руху з сацыяльна-эканамічнымі і сацыяльна-палітычнымі працэсамі, якія адбываліся ў адпаведны час у Еўропе. Прапанаванае даследаванне прадугледжвае хаця б частковае запаўненне ўтворанай лакуны.

У сярэднявечнай Еўропе са знікненнем катарызму і да прыходу гусітаў каталіцкая царква вызнавала вальдэнсаў найбольш небяспечнай ерэтычнай сектай. Гэты рух узнікае на поўдні сучаснай Францыі ў 70-ых гг. XII ст., з цягам часу распаўсюджваецца ад Пірэнеяў да Карпатаў пад самымі рознымі назвамі: вальдэнсы (ад заснавальніка – Вальдо), бедныя з Ліёна, або леаністы (родны горад Вальдо), рункарыі (глава італьянскай галіны – Іаан з Ронка), мантанэлі або ўльтрамантаны (тыя, хто жыве ў гарах або за гарамі), бедныя духам, бедныя ламбардцы і інш. З пачатку XV ст. у інквізітарскіх дакументах яны паступова зліліся з ведзьмамі і гусітамі, у выніку чаго "класічны" вальдызм спыніў сваё існаванне. У 1532 г. вальдэнсы афіцыйна далучыліся да пратэстанцкага руху, а ў 1975 г. аб'ядналіся з Італьянскай метадысцкай царквой. У дадзены час вальдэнсы жывуць на Поўначы Італіі (з цэнтрам у П'емонце, горад Торэ Пелічэ), Германіі, ЗША, Аргентыне і Уругваі, будучы, такім чынам, адзіным ерэтычным рухам, які здолеў легалізавацца і праіснаваць да нашага часу.

Праблема міжрэлігійнага і міжкультурнага супрацьстаяння ў свеце, цесна пераплеценая з праблемай бежанства, з'яўляецца адной з самых істотных на працягу ўсёй свядомай гісторыі чалавецтва. Таму ў навуцы ідзе пастаянны пошук вопыту агульнага жыцця прадстаўнікоў розных канфесій і вераў. У дадзеным ключы грунтоўна аналіуецца вопыт суіснавання прадстаўнікоў розных канфесій і рэлігійных плыня.

На прасторах былога СССР гістарычныя даследаванні на сацыяльна-рэлігійную тэматыку працяглы час былі абмежаваныя з ідэалагічных, палітычных і гуманітарных прычын. Не з'яўляецца выключэннем і рух вальдэнсаў, які, з аднаго боку, разглядаўся як сярэднявечная ерась (без гісторыка-геаграфічнай спецыфікі), а з другога – як сацыяльны пратэст у межах класавага грамадства.

Яшчэ адной адметнай рысай традыцыйнага вывучэння вальдэнсаў у Еўропе з'яўляецца яго разгляд у межах Рэфармацыі без належнай увагі на папярэдні перыяд іх існавання.

Акрамя таго, рух вальдэнсаў з'яўляецца заўважнай часткай гісторыі таго рэгіёна сярэднявечнай Еўропы, які не трапляе ў палітычныя межы найбуйнейшых еўрапейскіх дзяржаў Сярэднявечча: Францыі, Германіі і Італіі. Таксама вядома, што гэты рух яшчэ ў Сярэднявеччы пашырыўся па тэрыторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

*Навуковая значнасць.* Па-першае, вальдэнсы – самы старажытны ерэтычны рух, які мае непарарыўную гісторыю з Сярэднявечча да нашых дзён, што з'яўляецца ўзорам рэлігійна-сацыяльнай адаптацыі на працягу сямі з паловай стагоддзяў. Важна вывучыць "класічны" перыяд яго існавання, каб зразумець сутнасць самога руху.

Па-другое, было абвергнута меркаванне наконт адзінства або раз'яднанасці вальдызму ў сярэднявечнай Еўропе [184; 255, p. 3].

Па-трэцяе, у гістарычнай літаратуры вальдэнсы разглядаліся (і працягваюць разглядацца пэўным колам даследчыкаў) папярэднікамі пратэстантаў. Такім чынам, разуменне прычын і асаблівасцяў узнікнення і пашырэння вальдэнскага руху дае магчымасць глыбей даследаваць прычыны ўзнікнення і пашырэння пратэстантызму, яго сацыяльную базу і прычыны поспеху, у тым ліку і для беларускіх земляў.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

### Сувязь работы з навуковымі праграмамі, тэмамі

Дадзеная даследаванне звязана з распрацоўкай курса сусветнай гісторыі ў Рэспубліцы Беларусь, якая ажыццўляецца Беларускім дзяржаўным універсітэтам сумесна з Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Дысертацыя выконвалася ў рамках навукова-даследчых работ «Христианизация белорусских земель, общее и особенное в контексте исторических процессов в Центральной и Восточной Европе» (№ дзяржаўнай рэгістрацыі 20112167 ад 20.06.2011), «Религиозная сакрализация власти и социальных институтов славянского общества на территории Беларуси и в регионе Восточной Европы в древности и средневековье» (№ дзяржаўнай рэгістрацыі 20161679 ад 19.05.2016) і трох праектаў па грантах БДУ для студэнтаў і аспірантаў: "Применение методов исторической лингвистики при исследовании источников по истории еретических движений в Центральной и Восточной Европе" (2011 г.), "Проблема социально-политических, этнических и конфессиональных идентификаторов в античных и средневековых обществах Ближнего Востока и Западной Европы" (2012 г.) і "Распространение западного христианства в восточноевропейских землях в контексте социально-политического развития Европы в Высоком и Позднем Средневековье" (2014 г.)

## Мэта і задачы даследавання

*Мэта даследавання* – вызначыць асаблівасці вальдызму як самастойнага руху з моманту яго ўзнікнення да заканчэння "класічнага" перыяду існавання, з улікам хcraналагічных зменаў і рэгіянальнай спецыфікі.

Для вырашэння мэты былі выкананы наступныя *задачы*:

выявіць храналагічныя межы існавання вальдэнсаў як самастойнага руху, прасачыць узаемасувязь вальдызму з катарствам і гусізмам;

вызначыць асноўныя прычыны і фактары ўзнікнення і пашырэння руху вальдэнсаў з улікам тэрытарыяльнай спецыфікі;

вызначыць, ці былі вальдэнсы адзіным рухам на працягу "класічнага" перыяду;

вызначыць рэгіянальныя асаблівасці вучэння вальдэнсаў у XIII – пачатку XV ст.

*Аб'ектам работы* з'яўляецца гісторыя Еўропы канца XII – пачатку XV ст., *прадметам* – рух вальдэнсаў ад моманту ўзнікнення да пачатку XV ст.

*Храналагічна* работа ўключае перыяд з 1170-х гг. да пачатку XV ст. Ніжняя мяжа (1170-я гг.) абазначае пачатак існавання вальдэнскага руху: зварот Вальдо ў "сапраўдную" веру. Верхняя (пачатак XV ст.) – заканчэнне існавання вальдэнсаў як самастойнага руху і "змяшэнне" іх з ведзьмамі і гусітамі.

*Геаграфічна* праца ахоплівае ўсе рэгіёны распаўсюджання вальдэнсаў у адзначаны перыяд. Асаблівы акцэнт зроблены на неаднародныя ў этнічным плане рэгіёны, дзе рух вальдэнсаў развіваўся найбольш актыўна.

## Навуковая навізна даследавання

Навуковая навізна дысертацыйнага даследавання заключаецца ў тым, што ў ім упершыню ў гістарыяграфіі вылучаны перыяд існавання "класічнага" вальдызму (канец XII – пачатак XV ст.). Прадстаўлены сістэмны аналіз яго ўзнікнення, пашырэння і эвалюцыі. Вызначаны месца і роля супрацьстаяння з каталіцкай царквой, катарамі і іншымі рэлігійнымі і сацыяльнымі групамі (вальдызм узнікае як рэакцыя на катарскі рух, рыхтуе глебу і ўплывае на ідэі Яна Гуса і ранніх гусітаў, але потым трапляе пад уплыў апошніх і страчвае свае "класічныя" рысы). Таксама ўпершыню выяўлены спецыфічныя для кожнага канкрэтнага еўрапейскага рэгіёна пашырэння механізмы сацыяльна-эканамічнай адаптацыі вальдэнсаў. Устаноўлена, што адаптацыйныя механізмы выклікалі трансфармацыю асобных палажэнняў веравызнання вальдэнсаў (пераход да таемнай пропаведзі ва ўмовах узмацнення інквізіцыйнага ўціску; нівеляванні забаронаў клятвы, працы і валодання маёмасцю для інтэграцыі ў сістэму сацыяльных і палітычных адносінаў сярэднявечнага горада; абыход забароны гвалту ў сітуацыі шырокай падтрымкі сярод мясцовага насельніцтва).

чыстым выглядзе толькі на сваёй Радзіме – на поўдні сучаснай Францыі. Ва ўсіх астатніх рэгіёнах мы маем справу з яго мадыфікацыямі, абумоўленымі неабходнасцю прыстасавання да навакольных рэалій [1; 2; 3; 4; 5].

**Рэкамендацыі па практычнаму выкарыстанню дысертацыі**

Вынікі навуковага даследавання могуць быць выкарыстаны ў навуковай, вучэбнай і вучэбна-метадычнай рабоце, пры даследаванні пытанняў развіцця, станаўлення і распаўсюджання ерэтычных рухаў, іх узаемадзеяння з каталіцкай царквой і сацыяльнай адаптацыі. У рамках педагагічнага працэсу вынікі дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы вучэбных праграм, лекцыйных курсаў, падручнікаў і дапаможнікаў па медыявістыцы, гісторыі рэлігій, крыніцазнаўству, для аналітычных выкладак пры рабоце з вернікамі пратэстанцкіх дэнамінацый. Цалкам ці часткова яны таксама могуць быць уведзены ў склад спецкурсаў па гісторыі Заходняй Еўропы і рэлігіязнаўству.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ

### Артыкулы ў навуковых выданнях у адпаведнасці з п.18 Палажэння аб прысуджэнні навуковых ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь

1. Володина, А. В. Общины «paupers catholici» и «paupers reconciliati» в рамках религиозного подъёма второй половины XI – первой половины XIII века / А. В. Володина // Bractwa religijne w średniowieczu i w okresie nowożytnym (do końca XVIII wieku) / red.: D. Burdzy, B. Wojciechowska. – Kielce, 2014. – S. 19–31.

2. Валодзіна, А. В. Тэрытарыяльныя асаблівасці веравучэння вальдэнсаў Паўночнай Італіі і Паўднёвай Францыі паводле трактата Сальва Бурчы «Liber Supra Stella» / А. В. Валодзіна // Гуманітар.-экан. весн. – 2014. – № 4. – С. 18–23.

3. Валодзіна, А. В. Асаблівасці вальдэнскага руху ў Каралеўстве Багемія ў XIV ст. / А. В. Валодзіна // Весн. Гродзен. дзярж. ун-та. Сер. 1, Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія. – 2016. – Т. 8, № 2. – С. 62–70.

4. Валодзіна, А. В. Асаблівасці з'яўлення, распаўсюджання і дактрыны вальдэнсаў на тэрыторыі сучаснай Польшчы / А. В. Валодзіна // Весн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А : Гуманитар. науки. – 2016. – № 9. – С. 76–82.

5. Валодзіна, А. В. Станаўленне і развіццё руху вальдэнсаў у XII–XIV стст. / А. В. Валодзіна // Беларус. гіст. часоп. – 2018. – № 2. – С. 19–27.

### Артыкулы ў іншых навуковых выданнях

6. Валодзіна, А. В. Споведзь веры вальдэнсаў [Электронны рэсурс] /

А. В. Валодзіна // Scriptorium: история древнего мира и средних веков : электрон. студен. науч. журн. – 2009. – № 1. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).

7. Валодзіна, А. Лісты Інакенція III [Электронны рэсурс] / А. Валодзіна // Scriptorium: история древнего мира и средних веков : электрон. студен. науч. журн. – 2009. – № 2. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).

8. Валодзіна, А. В. «Бедныя каталікі», ці Зварот ерэтыкоў да каталіцтва [Электронны рэсурс] / А. В. Валодзіна // Scriptorium: история древнего мира и средних веков : электрон. студен. науч. журн. – 2009. – № 3. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).

9. Валодзіна, А. В. Рэскрыпт ерэсіярхаў Ламбардыі да леаністаў Алеманіі [Электронны рэсурс] / А. В. Валодзіна // Scriptorium: история древнего мира и средних веков : электрон. студен. науч. журн. – 2010. – № 5. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).

10. Валодзіна, А. В. Італьянская галіна вальдэнсаў у канцы XII – I ½ XIII стагоддзяў [Электронны рэсурс] / А. В. Валодзіна // Scriptorium: история древнего мира и средних веков : электрон. студен. науч. журн. – 2010. – № 6. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).

11. Валодзіна, А. В. Выкарыстанне камп'ютарнага рэсурсу «Patrologia Latina» для даследавання канцэпту «Pauperes catholici» / А. В. Валодзіна // Компьютерная лингвистика: научное направление и учебная дисциплина : сб. науч. ст. / Гомел. гос. ун-т. – Гомель, 2010. – Вып. 1. – С. 60–63.

12. Володина, А. В. Итальянская ветвь вальденсов согласно рескрипту ересиархов Ломбардии к еретикам Алемании / А. В. Володина // Гуманитарное знание в новом тысячелетии : сб. науч. ст. / науч. ред.: В. М. Овчинников ; С. И. Минкин. – Смоленск, 2011. – Вып. 1. – С. 93–101.

13. Валодзіна, А. В. Рэлігійны рух вальдэнсаў у канцы XII – першай паловы XIII стагоддзяў і яго асаблівасці / А. В. Валодзіна, І. А. Еўтухоў // Сборник научных работ студентов Республики Беларусь «НИРС 2010» / редкол.: А. И. Жук [и др.]. – Минск, 2011. – С. 527.

14. Валодзіна, А. В. Вера італьянскіх вальдэнсаў на прыкладзе групы Бернарда Прыма [Электронны рэсурс] / А. В. Валодзіна // Scriptorium: гісторыя старажытнага свету і сярэдніх вякоў : электрон. навук. часоп. – 2012. – № 7. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM).

15. Валодзіна, А. В. Пераклад Бібліі Вальдо / А. В. Валодзіна // СКРИЖАЛИ. Сер. Ветхозавет. исслед. / Мин. духов. акад. – Минск, 2015. – Вып. 9. – С. 115–122.

**Артыкулы ў зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый**

16. Валодзіна, А. В. «Бедныя каталікі» – папярэднікі ордэна

дамініканаў / А. В. Валодзіна // Христианство в Европе: взгляд в прошлое или путь в будущее : материалы междунар. студен. конф., Минск, 10–12 дек. 2010 г. / Ин-т теологии им. св. Мефодия и Кирилла Белорус. гос. ун-та, Междунар. обществ. об-ние «Христианский образовательный центр им. святых Мефодия и Кирилла» ; сост. Г. Н. Петровский. – Минск, 2010. – С. 42–46.

17. Володина, А. В. Уставы вальденсийских обществ и францисканского ордена: общее и особенное [Электронный ресурс] / А. В. Володина // ЛОМОНОСОВ – 2011 : материалы Междунар. молодеж. науч. форума, Москва, 11–15 апр. 2011 г. / отв. ред.: А. И. Андреев [и др.]. – М., 2011. – 1 электрон. опт. диск (DVD-ROM).

18. Валодзіна, А. В.Прычыны адлучэння ад царквы Пятра Вальдо і яго паплечнікаў-вальдэнсаў [Электронны рэсурс] / А. В. Валодзіна // Лістападаўскія сустрэчы – VIII : зб. арт. па матэрыялах Міжнар. навук. канф. у гонар акад. М. М. Нікольскага і У. М. Перцава, Мінск, 2009 г. / навук. рэд.: В. А. Фядосік, І. А. Еўтухоў. – Мінск, 2011. – Рэжым доступу: http://www.hist.bsu.by/images/stories/files/nauka/konf/ls/8/Volodina.pdf. – Дата доступу: 22.08.2018.

19. Валодзіна, А. В. Ерасі на Беларусі ў XV стагоддзі: пастаноўка пытання / А. В. Валодзіна // Романовские чтения – 8 : сб. ст. Междунар. науч. конф., Могилев, 24 нояб. 2011 г. / Могилев. гос. ун-т ; редкол.: Я. Г. Риер (пред.) [и др.]. – Могилев, 2012. – С. 161–163.

20. Володина, А. В. Роль катарства в возникновении и становлении вальденсов [Электронный ресурс] / А. В. Володина // ЛОМОНОСОВ – 2012 : материалы Междунар. молодеж. науч. форума, Москва, 9–13 апр. 2012 г. / отв. ред.: А. И. Андреев [и др.]. – М:, 2012. – 1 электрон. опт. диск (DVD-ROM).

21. Валодзіна, А. Праблема перакладу сярэднявечных лацінскіх ерэтычных тэкстаў на беларускую мову / А. Валодзіна // Трэці Міжнародны Кангрэс даследчыкаў Беларусі : працоўн. матэрыялы, Коўна (Літва), 11 – 13 кастрычніка 2013 г. / Vytautas Magnus Univ. – Kaunas, 2014. – Т. 3. – С. 495–499.

22. Володина, А. В. Сравнительный анализ инквизиционных процессов над вальденсами в Польше и Чехии в XIV веке [Электронный ресурс] / А. В. Володина // ЛОМОНОСОВ – 2015 : материалы Междунар. молодеж. науч. форума, Москва, 13–17 апр. 2015 г. / отв. ред.: А. И. Андреев, А. В. Андриянов, Е. А. Антипов. – М., 2015. – 1 электрон. опт. диск (DVD-ROM).

23. Володина, А. В. Особенности движения вальденсов на раннем этапе / А. В. Володина // Молодые исследователи – регионам : материалы Междунар. науч. конф., Вологда, 20–24 апр. 2015 г. : в 3 т. / Вологод. гос. ун-т [и др.] ; отв. ред. А. А. Синицын. – Вологда, 2015. – Т. 3. – С. 392–393.

24. Валодзіна, А. В.Булы Папы Рымскага Інакенція III як крыніца па гісторыі вальдэнсаў / А. В. Валодзіна // Романовские чтения – 10, посвящённые 80-летию со дня основания исторического факультета : сб. ст. Междунар. науч. конф., Могилев, 27–28 нояб. 2014 г. / Могилев. гос. ун-т ; редкол.: И. В. Шардыко (пред.) [и др.]. – Могилев, 2015. – С. 41–42.

25. Валодзіна, А. В. З’яўленне вальдэнсаў у Польшчы: пытанне ідэнтыфікацыі / А. В. Валодзіна // Религия и/или повседневность : материалы IV Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 16–18 апр. 2015 г. / Респ. ин-т высш. шк. ; под ред. С. И. Шатравского, М. В. Казмирук. – Минск, 2015. – С. 18–24.

26. Валодзіна, А. В. Стогадовая эвалюцыя аўстрыйскіх вальдэнсаў: ад «Пасаўскага ананіма» да «Кнігі выбраных» [Электронны рэсурс] / А. В. Валодзіна // Лістападаўскія сустрэчы – XI : матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 12–13 лістап. 2015 г. / Беларус. дзярж. ун-т. – Минск, 2016. – Рэжым доступу: http://www.hist.bsu.by/images/stories/files/nauka/konf/l-2015/LS_XI/6-1/Valodzina.pdf. – Дата доступу: 23.08.2018.

27. Володина, А. В. Особенности вальденского вероучения в Пьемонте в конце XIV в. / А. В. Володина // Молодежь – науке. 2016 : материалы молодеж. науч-практ. конф. "Актуальные проблемы отечественной и всеобщей истории, культурологии и музеологии", Псков, 4–8 апр. 2016 г. / Псков. гос. ун-т. – Псков, 2016. – Т. 8. – С. 129–133.

28. Володина, А. В. Вальденсы немецко-швейцарско-французского пограничья в конце XIV–XV вв. / А. В. Володина // Белгородский диалог–2016: проблемы филологии, всеобщей и отечественной истории : сб. материалов VIII Междунар. молодеж. науч. форума, Белгород, 7–9 апр. 2016 г. / Белгор. гос. нац. исслед. ун-т ; редкол.: А. И. Папков (отв. ред.) [и др.]. – Белгород, 2016. – С. 113–117.

**Тэзісы выступленняў на навуковых канферэнцыях**

29. Валодзіна, А. В. Рэгіянальныя асаблівасці вальдэнсаў [Электронны рэсурс] / А. В. Валодзіна // Лістападаўскія сустрэчы – X : зб. арт. па матэрыялах Міжнар. навук. канф. у гонар акад. М. М. Нікольскага і У. М. Перцава, Мінск, 14 – 15 лістапада 2013 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; навук. рэд. В. А. Фядосік, І. А. Еўтухоў. – Мінск, 2013. – Рэжым доступу: http://www.hist.bsu.by/images/stories/files/nauka/konf/L-2013/Valodzina.pdf. – Дата доступу: 22.08.2018.

## РЭЗЮМЭ

Валодзіна Аляксандра Вадзімаўна

**Рух вальдэнсаў у канцы XII – пачатку XV стагоддзя**

**Ключавыя словы:** вальдэнсы, ерэтыкі, рэлігійныя рухі, каталіцкая царква, сацыяльная адаптацыя, Еўропа, міжрэлігійныя ўзаемаадносіны, катары.

**Мэта даследавання:** вызначыць асаблівасці вальдызму як самастойнага руху (а не як ізаляванай сістэмы) з моманту яго ўзнікнення да заканчэння існавання, з улікам храналагічных зменаў і рэгіянальнай спецыфікі.

**Метады даследавання:** агульнанавуковыя (аналіз, сінтэз, абагульненне, параўнанне, класіфікацыя) і спецыяльныя гістарычныя метады (гісторыка-генетычны, гісторыка-тыпалагічны, рэтраспектыўны, метад гістарычнай рэкантрукцыі і гістарычнага сінтэзу). Пры працы непасрэдна з тэкстамі гістарычных крыніц выкарыстоўваўся метад герменеўтычнага аналізу. Выключную ролю адыграў метад картаграфавання. Метадалагічнай асновай работы з'явіліся прынцыпы гістарызму, аб'ектыўнасці і прычыннай абумоўленасці.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна:** Упершыню ў беларускай і еўрапейскай гістарыяграфіі вылучаны перыяд існавання “класічнага” вальдызму. Прадстаўлены сістэмны аналіз яго узнікнення, пашырэння і эвалюцыі вальдэнскага руху ў Еўропе ў канцы XII – пачатку XV ст. Устаноўлены асаблівасці першапачатковага рэгёна ўзнікнення гэтага руху (вольныя імперскія гарады і гарады-камуны ў памежнай зоне паміж Германіяй, Францыяй і Італіяй). Вызначаны месца і роля супрацьстаяння з каталіцкай царквой, катарамі і іншымі рэлігійнымі і сацыяльнымі групамі: пачатак руху выкліканы неабходнасцю супрацьстаяння з катарамі; канец “класічнага” вальдызму ў XV ст. звязаны з тым, што на захадзе Еўропы ў інквізітарскіх працах вальдэнсаў пачынаюць блытаць з ведзьмамі, а на ўсходзе паслядоўнікі Вальдо трапляюць пад уплыў ідэй Яна Гуса. Таксама ўпершыню выяўлены спецыфічныя для кожнага канкрэтнага еўрапейскага рэгёна пашырэння механізмы сацыяльна-эканамічнай адаптацыі вальдэнсаў, якія выклікалі трансфармацыю асобных палажэнняў веравызнання.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні:** Вынікі навуковага даследавання могуць быць выкарыстаны ў навуковай, вучэбнай і вучэбна-метадычнай рабоце. У рамках педагагічнага працэсу вынікі дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы вучэбных праграм, лекцыйных курсаў, падручнікаў і дапаможнікаў па медыявістыцы, гісторыі рэлігій, крыніцазнаўству, для аналітычных выкладак пры рабоце з вернікамі пратэстанцкіх дэнамінацый.

**Галіна выкарыстання:** «Гісторыя сярэдніх вякоў», «Гісторыя Еўропы», «Гісторыя рэлігіі».

# РЕЗЮМЕ

Володина Александра Вадимовна

**Движение вальденсов в конце XII - начале XV века**

**Ключевые слова:** Вальденсы, еретики, религиозные движения, католическая церковь, социальная адаптация, Европа, межрелигиозные взаимоотношения, катары.

**Цель исследования:** изучить вальдизм с момента его возникновения до окончания существования как самостоятельного движения с учетом хронологических изменений и региональной специфики.

**Методы исследования:** общенаучные (анализ, синтез, обобщение, сравнение, классификация, системный) и специальные исторические методы (историко-генетический, историко-типологический, ретроспективный, метод исторической реконструкции и исторического синтеза). При работе с текстами исторических источников использовался метод герменевтического анализа. Исключительную роль отыграл метод картографирования. Методологической основой работы явились принципы историзма и объективности.

**Полученные результаты и их новизна:** Впервые в белорусской и европейской историографии выделен период существования «классического» вальдизма. Представлен системный анализ возникновения, распространения и эволюции вальденского движения в Европе в конце XII - начале XV вв. Установлены особенности первоначального региона возникновения этого движения (вольные имперские города в пограничной зоне между Германией, Францией и Италией). Определены место и роль противостояния с католической церковью, катарами и другими религиозными и социальными группами: начало движения вызвано необходимостью противостояния с катарами; конец «классического» вальдизма в XV в. связан с тем, что на западе Европы в инквизиторских работах вальденсов начинают путать с ведьмами, а на востоке вальденсы попадают под влияние идей Яна Гуса. Также впервые определены специфические для каждого конкретного европейского региона распространения механизмы социально-экономической адаптации вальденсов, которые вызвали трансформацию отдельных положений вероучения.

**Рекомендации по использованию:** результаты научного исследования могут быть использованы в научной, учебной и учебно-методической работе. В рамках педагогического процесса результаты проекта могут быть использованы при разработке учебных программ, лекционных курсов, учебников и пособий по медиевистике, истории религий, источниковедению, для аналитических выкладок при работе с верующими протестантских деноминаций.

**Область применения:** «История средних веков», «История Европы», «История религии».

## SUMMARY

Aliaksandra V. Valodzina

**The Waldensian movement in the late 12th - early 15th centuries**

**Key words:** Waldenses, heretics, religious movements, Roman Catholic Church, social adapting, Europe, interfaith connections, Cathari.

**Aim of the research:** learn about the Waldensian dissent from the moment of its emergence till the end of its existence as a separate movement, considering chronological changes and regional specificity.

**Research methods:** general scientific (analysis, synthesis, generalization, comparison, classification, system-based method) and specific historical methods (historical-genetic, retrospective; cartography). The method of conceptual and hermeneutic analysis was used while working with the texts from primary sources. The research is methodologically based on the principles of historicism and objectivity.

**Obtained results and their novelty:** for the first time in Belarusian and post-soviet historiography the author has managed to make a system-based analysis of the emergence, spreading and evolution of the Waldensian dissent in Europe at the XII – beginning of the XV century; to reveal the peculiarities of the initial region where the Waldensian dissent emerged (free imperial cities of German-France-Italian border zone); to trace the specific character of social and economic adapting of the Waldensians to certain regions (refusal from the initial doctrine of the inviolable swear, acquiring private property and the possibility of violence while adapting to certain environments); to determine the place and the role of the Waldensian confrontation with the Roman Catholic Church, the Cathari and other religious and social groups: the emergence of the dissent was a consequence of confrontation with the Cathari and pure Waldensian dissent ended at the beginning of the XV century when in Western Europe the inquisition started to confuse the Waldenses with witches and in Eastern Europe the Waldo followers fell under Jan Gus's ideas influence.

**Application opportunities:** the results of the research can be applied to academic studies and teaching. Within the framework of education the results of the research can be used while creating the syllabus, lectures, textbooks and reference books on medieval studies, religious history, source studies. Also the results of the research can be used for analytic compilations while working with the protestant believers.

**Fields of possible application:** "History of the Middle Ages", "European History", "Religious history".